З 1947 на к/студыі «Беларусьфільм». Здымаў кінахроніку, агітацыйна-прапагандысцкія фільмы, сюжэты для кіначасопісаў, дакум. і ігравыя фільмы. Для яго творчасці характэрны рэаліст. ўзнаўленне жыццёвых абставін, лаканізм выяўл. сродкаў, дакладнасць партрэтных характарыстык, арганічнае ўключэнне герояў у натуральнае асяроддзе. Сярод работ фільмы: ігравыя «Палеская легенда» (1957), «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (1958), «Чалавек не здаецца» (1960), «Рагаты бастыён» (1964), дакум. «У заводскім раёне» (1950), «Новы Мінск» (1953), «На зямлі беларускай» (1957) і інш. Аператар-пастаноўшчык тэлевізійнага маст. фільма «Побач з вамі» (1967).



*У.Л.Акуліч.*

**АКУЛЬТУРА́ЦЫЯ** (англ. acculturation ад лац. ad да + cultura адукацыя, развіццё), працэс і вынік узаемаўплыву розных культур; змяненне матэрыяльнай культуры, звычаяў і вераванняў сацыякульт. групы (рэцыпіента), якое адбываецца пры працяглым кантакце з інш. групай (донарам). У працэсе А. асобны народ або яго частка (саслоўе, клас, сац. група, нац. меншасць) засвойваюць культуру і мову другога народа (звычайна дэмаграфічна дамінуючага ці больш культурна развітога), але ў той жа час не страчваюць поўнасцю сваю культуру, гіст. памяць і нац. самасвядомасць. Даследаванне працэсаў узаемаўплыву культур пачалося ў 19 ст. ў англ. сац. антрапалогіі. Тэрмін «А.» ўпершыню быў прыменены ў канцы 19 ст. і пачаў шырока выкарыстоўвацца ў амер. культ. антрапалогіі. У навук. ужытку замацаваўся ў 1920—30-я гг., калі М.Мід, Р.Лінтан, Б.Маліноўскі, Р.Рэдфілд і інш. вывучалі механізмы і спецыфіку А. ў сувязі з уплывам англасаксонскай культуры ЗША на карэннае насельніцтва (індзейцаў) і афра-амерыканцаў. Рэцыпіентная група можа цалкам адхіляцца ад прыўносімых каштоўнасцей, цалкам прымаць іх альбо ставіцца да іх выбарачна. У выніку апошняга варыянта ўзнікаюць т.зв. сінкрэтычныя культуры. А. можа мець пазітыўны характар, калі прыводзіць да ўзбагачэння культуры-рэцыпіента, абмен можа быць плённым пры вольным выбары накірунку культ. развіцця. Імкненне больш развітога грамадства гвалтоўна навязаць слабейшаму свае культ. стандарты можа выклікаць рэакцыю пратэсту і адмаўлення. У выпадку, калі магутны знешні ўплыў інш. культуры перавышае пэўную «крытычную мяжу», узнікае пагроза для культуры-рэцыпіента, паколькі гэта можа прывесці да збяднення ці поўнага знікнення асобных нац. традыцый, абрадаў, звычаяў, артэфактаў і інш.

У розныя гіст. эпохі бел. культура неаднолькава рэагавала на працэсы А. з боку культур суседніх і больш далёкіх народаў. Асобныя замежныя этнакульт. з'явы, традыцыі поўнасцю пераймаліся або, наадварот, не ўспрымаліся і адмаўляліся. Таксама ў выніку А. ўзнікалі унікальныя маст. феномены (напр., полацкая і гарадзенская школы дойлідства, бел. іканапісная школа, бел. рэзь, віленскае барока і інш.), для якіх было характэрна арганічнае спалучэнне мясц. і іншаэтнічных традыцый. У эпоху сярэдневякоўя пераважаў уплыў усх. візант., у час Рэнесансу — зах.-еўрап. культуры, што праяўлялася найперш у развіцці бел. выяўл. мастацтва, архітэктуры, л-ры і музыкі. На працягу 17—1-й пал. 19 ст. частка бел. грамадства (у асн. прадстаўнікі прывілеяваных саслоўяў — дваранства, шляхта, духавенства) падвяргалася працэсам паланізацыі, а ў 2-й пал. 19—20 ст. актыўная русіфікацыя ў большай ці меншай ступені закранула практычна ўсе сац. групы насельніцтва Беларусі. З канца 20 ст. і ў сучасны перыяд узмацніліся працэсы пэўнай вестэрнізацыі бел. культуры, што ў розных формах назіраецца ў сферы выяўл., тэатр. і кінамастацтва, л-ры, папулярнай музыкі. Пра гэта сведчаць, напр., фарміраванне і развіццё бел. шоу-бізнесу ў сферы эстр. музыкі, пашырэнне мадэрнісцкіх і постмадэрнісцкіх кірункаў у л-ры, выяўл. і тэатр. мастацтве, распаўсюджанне сярод часткі людзей норм зах. ладу жыцця (паводзін, каштоўнасных арыентацый, моды і да т.п.).

*Э.С.Дубянецкі, С.Л.Сакума, В.Р.Языковіч.*

**АКУЛЬТЫЗМ** (ад лац. occultus патаемны, скрыты), вучэнне і адпаведныя практыкі (алхімія, астралогія і інш.), заснаваныя на прызнанні існавання звышнатуральных, таямнічых сіл у чалавеку і сусвеце. У А. рацыянальнасць спалучаецца з міфал. ўяўленнямі, напр., аб аналогіі чалавека і свету (мікра- і макракосма). Вядомы з часоў антычнасці. У эпоху элінізму была распрацавана канцэпцыя ўсеагульных таямнічых сувязей частак Сусвету; кабалістыка падкрэслівае спалучэнне сэнсу слоў з іх графічнымі выявамі; у сярэдневякоўі А. перасякаўся з ерэтычнымі вучэннямі. Асабліва распаўсюдзіўся ў культуры Адраджэння (Агрыпа Нетэсгаймскі, Дж.Бруна, Дж.Кардана, Б.Тэлезіо). У 17—18 ст. акультныя ўяўленні аднаўляліся ў сац. і утапічных вучэннях (разенкрэйцэры, Т.Кампанела, масонства); у канцы 19 ст. з'явіліся эклектычныя плыні (тэасофія, антрапасофія). На традыц. бел. культуру А. не аказаў значнага ўплыву. З сярэдзіны 20 ст. распаўсюдзіўся камерцыйны А. (новая астралогія, акультная медыцына, манціка, новая алхімія).

*Літ.:* Р а б и н о в и ч В.Л. Алхимия как феномен средневековой культуры. М., 1979.

*В.Р.Языковіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ